# РОДНАСЦЬ

## ***ЗАПЯВАЛА***

### САЛДАТ ПЕРАМОГІ

Вясеннія кветкі, агні
І ордэн старога салдата.
Чырвоныя майскія дні –
Расіі галоўнае свята.

Прад помнікам стратам сваім
Герой  перамогі схіліўся.
Дыміліся вёрсты за ім –
Нібы для вайны нарадзіўся.

Юнацтва сталела ў баях
З бязлітаснай смерцю ў абдымку.
Стаяць аднагодкі ў вачах,
Зайшлі з небыцця на хвілінку.

Вайна патрабуе ахвяр.
У мужных свая аксіёма –
Адбілі чужынцаў удар
Насуперак мудрым законам.

Спынілі бліцкрыг бранявы
З адной на дваіх трохлінейкай.
Рубеж утрымаў радавы
«Кактэйлем» – з гаручым  бутэлькай.

Да ран прыгарэлі бінты –
Вайны злой крывавыя гронкі.
Герояў хаваюць франты,
Галовы схілілі рамонкі.

Плывуць пахавальныя ў тыл
На хвалях журбы і праклёнаў.
Жах помсты ад Брэста затым
Данеслі ў Берлін батальёны.

Над светам знявечаным – мір!
Салют над парадам і хмары.
Гвардзейцы трымаюць ранжыр,
Ляцяць на брусчатку штандары.

Стаіць на Паклоннай гары
Апошні герой перамогі.
Цюльпанамі памяць гарыць,
Як полымя вечнай трывогі.

Збярог у лавіне агню
Дом родны салдат перамогі.
Ён зноў прынясе нам вясну…
Лепш, свет, не збівайся з дарогі.

2010

РУСКІ АДЛІК

У канцы лета 1942 года пачалася Сталінградская бітва, якая закончылася ў студзені 1943 года акружэннем і разгромам фашысцкай групоўкі войск.

**Рабінавая ноч**

Рабінавая ноч красуе – жнівень:
Маланкі, шквалы ветру, перуны…
Карычневы напаў на горад лівень
З руінамі, агнём, бядой вайны.

На месяцы ідзе адлік нягоды.
А тут хвіліну нельга прастаяць.
Здаецца, што за ўсе на свеце шкоды
Зямля з людзей тут хоча запытаць.

Заблыталі наш свет хрыстапрадаўцы.
Яму патрэбны сёння Сталінград,
Рабінавая ноч і хлопцы-знаўцы,
Гатовыя спыніць свінцовы град.

І толькі ім, адным, куды вядома
Планеце нашай з пекла выплываць,
Каб адвярнуць ад бацькаўскага дома
Чужынную захопніцкую раць.

Дом Паўлава гарыць, фашысты лезуць.
Іх тут загіне больш, чым за Парыж.
А колькім давядзецца яшчэ змерзнуць?
Рабінавая ноч: пярун і крыж.

Нахабная арда, пакуль пры зброі.
Атака за атакай – не спыніць.
Узводам армія выходзіць з бою,
Загадана: прарыў паганцаў збіць.

На тым напрамку змагароў не стала.
І некаму за сонца пастаяць.
Ад кулі сэрца біцца перастала,
І аўтамат руцэ ўжо не ўтрымаць.

Патух навек дзень у вачах салдата.
Дачасна страціў запявалу свет.
Той не хаваўся за спіною брата,
Да першародства свой усклаў букет.

Ідуць сыны на гібель, бы на працу,
Не волаты, звычайныя хлапцы.
Хаця яны зусім не нававбранцы,
А батальёнаў штурмавых байцы.

Згарае да жыцця іх пераправа –
Дашчэнту прыстраляная мяжа.
На ёй байцы: бязвусы, побач бравы,
Пад кулямі варожымі ляжаць.

Фашыст лютуе, зносіць пераправу.
Дзе сіл узяць, каб адстаяць яе?
Павінны людзі быць з якога сплаву,
Каб выжыць з перамогай па вясне?

Рабінавыя ночы Сталінграда
У памяці зарніцамі гараць.
Камандуе хлапец той зарападам,
Ён пераправу здолеў утрымаць.

**Запявала**

Абудзіла горад ранне,
Хвалі гойдаюць блакіт.
На Мамаевым кургане
Лёсу рускага радкі.

Бераг левы, бераг правы,
А вакол ідзе вайна.
Хлопец з чубам кучаравым
У акопе, старшына.

І не ў тыле, не ў палоне,
Не ў загінуўшых пакуль,
Ён трымае абарону.
Свет закрыў ад граду куль.

За спіною ж у гвардзейца
Волга – руская рака.
Да яе душы крадзецца
Злая сквапная рука.

Ад сівых вяршынь Каўказа
Да паўночных шэрых скал
Стаўка ставіць на калгасных
І заводскіх запявал.

Ад станкоў прыйшлі, ад плуга
Дом, зямлю абараніць.
Ёсць армейская папруга,
Вось яшчэ б – чым немца біць.

У баях растуць салдаты.
Рвецца ў сэрца гераізм
Па вуголлі роднай хаты,
Праз смурод пякучых гільз.

Ды ні ўсім у Сталінградзе
Далі ордэн за баі.
Ёсць медаль. З ім на парадзе
Пайшоў кожны б у страі.

Толькі як дажыць да свята?
Тут другі ліміт даюць:
Цэляць у цябе гарматы,
Кулямёты зблізку б’юць.

Памяць крочыць праз дні бітвы,
Вечным полымем гарыць.
Прозвішчы людзей гранітных
Не дае жывым забыць.

Твары на іконах-плітах
Праваслаўных, мусульман.
Іх імёны, бы малітвы,
Шэпчуць вусны расіян.

На Мамаевым кургане
Тайны нашых перамог:
Маці, меч. І запытанне –
Як Радзіму ты бярог?

**Зорны маршрут**

Маладзік такі над Сталінградам,
Што іголкі можна падбіраць.
Салютуе жнівень зарападам –
Каго тут у ложках утрымаць?

Праўда, і рабінавыя ночы
Парушаюць жнівеньскі спакой.
Бачыць іх прагноз пакуль не хоча –
Неба, бы сляза, над галавой.

У маім жыцці-калейдаскопе
Будзе гэтай казкі не хапаць.
Засядзеўся досыць у акопе –
Самы раз да мілай завітаць.

А ў каханай спіць у вокнах цемра.
Каляровыя, знаць, бачыць сны.
Прачынайся, кліча зорны церам,
Сёння ноч дае нам выхадны.

Падкаціла тройка на праспекце,
У паклоне нізкім ліхтары.
Скакуны, хутчэйшыя на свеце,
Нас панеслі, быццам бы з гары.

Мае лейцы – жоўтыя прамені,
Не шкадуе месячык святла:
Па яго загадкавых струменях
Нас дарога ў неба павяла.

Кружым над Мамаевым курганам,
Вышэй толькі зоркі зіхацяць.
Іх кранаем голымі рукамі –
І не паляць, дзіўна так гарэць.

Па сцяжынцы месячнай над Волгай
Правім па сярэбранай вадзе.
Далей ад рабінавай трывогі
І бліжэй да радасных надзей.

Наш маршрут – шчаслівыя імгненні.
Не дарэмна, знаю, палеглі
На прасторах рускіх вымярэнняў
Цытадэлі волжскай кавалі.

На стагоддзе з небыцця мы выйшлі,
Шчыры і даверлівы народ.
Я на бераг, дзе струхнелі вішні,
Прызямляю свой месяцаход.

2011

## ***РОДНАСЦЬ***

### ЗАВОДСКІ РАЁН

Сталіца – навук бастыён.
Індустрыя тон задае,
У Мінску Заводскі раён –
Візітная картка яе.

Дзе ўчора шумелі бары
Над зданню імшыстых балот,
Выходзяць з варот трактары
І свеціцца аўтазавод.

Будоўлі не злічыць абшар,
Натужна дыміць паравоз,
Палёт паскарае наш шар.
І я непрыкметна падрос.

Заводскі рабочы раён –
Прытулак юнацтва майго.
Асеннім нахмураным днём
Прыняў ён студэнта свайго.

Пужаў сюжэт новых карцін,
Бы першы мой школьны дыктант.
Стаялі адзін на адзін
Вясковец і горад-гігант.

Па каменных джунглях ішоў,
Насустрач – бязлікі народ.
Пад струны чужых капяжоў
Вясны сустракаў надыход.

Чытальная зала, тэатр,
З паўцемры кранаў саксафон.
Вакзалы гукалі на старт,
Студэнцкі імчаў марафон.

Рамантыка, пошук, размах,
Парогі прайшоў, супрамат.
Спявалі вятры ў парусах,
Байцоў гартаваў будатрад.

Адклаў я па дому тугу.
У парку гулянне бурліць,
А я з танцпляцоўкі бягу
У трэцюю змену рабіць.

Пад гмахамі цэха станкі
У лад паслухмяна гудуць.
У працы з рабочай рукі
Майстры, інжынеры растуць.

Выходжу, як Бог, з прахадной,
Насустрач мне сонца плыве.
Дзень добры і светлы настрой –
Шчаслівы ідзе чалавек.

Без стомы – наперад, далей.
Дапісан апошні канспект.
Залік недаспаных начэй –
Выдатны дыпломны праект.

У марах на зорны парад
Імёны раслі з нематы.
Ды толькі не ведаў наш брат,
Што час быў тады залаты.

З надзеяй на добрых людзей
Сакурснік мой і інжынер
На хвалях зайздросных ідэй
Браў новы жыццёвы бар’ер.

Лісты да шчаслівых бацькоў
Ляцелі з сібірскай тайгі.
Якуцк, Сахалін, Урал, Пскоў –
Чуваць тут акцэнт дарагі.

Трывалыя ставяць масты
Раёнаў заводскіх  сыны.
Высокага гарту майстры,
Сапраўдныя людзі яны.

2009

# СЯЛЯНСКАЕ ГНЯЗДО

Сыны, лічы, у трэцім пакаленні –
Інтэлігенты. У Маскве жывуць.
Аблокі дзівам праз блакіт вясенні
Над гнёздамі сялянскімі плывуць.

Загадкавая траса ў паднябессі
За гарызонт прывабліва вядзе.
Хлапчук віхрасты з вёскі на Палессі
У крыгаход плыт гоніць па вадзе.

Ён з-пад далоні шлях далёкі бачыць.
Не па гадах сур'ёзны капітан.
Канём, касой, умее плугам правіць –
На ўсе часы вясковы талісман.

Яшчэ заўчора ён ілбом грэў шыбку
У матчынай жакетцы нападрост
І з марай фантастычнай у абдымку
Узводзіў над аколіцаю мост.

Над паплавамі, рэчкай, хатай, пуняй,
Над пеннай завірухаю садоў,
Над гонямі пад ізумруднай рунню –
Яны даўно не бачаць новых сноў.

Сялянскае гняздо нястомна рупіць,
Традыцыі і гонар беражэ.
Дзяцей жыццю ад хісткай люлькі вучыць:
Хто хоча есці, пасвіць і арэ.

Стагоддзі сціпла змест занатавалі
Зямных трывог вяскоўцаў на раллі:
Яны душу і сілы аддавалі,
Каб нівы палыном не зараслі.

Кругом быльнёг, глухотнае дзічэўе,
Дрыгва. Лучын дрыготкае святло.
Наш род праз войны, гаці і карчэўе
За лепшай доляй па вяках нясло.

Дзядуля ляда, з братам, узнімалі,
На зайздрасць злыдням стане гожы дом.
Сялян спякота, сцюжа не пужалі
І буры, што кружылі над гняздом.

І разлівалася па вёсцы свята,
Калі ў засекі звезены ўраджай,
Калі дзяўчат-красунь ляцелі сватаць.
І баль даваў вясельны каравай.

Манер вяскоўцам добрых не хапала,
Іх лубяны падводзіў часам густ.
А кемлівасць заўсёды выручала,
І вось герою адліваюць бюст.

Сялянскае гняздо, уклад і хата,
У нашы думкі, сутнасць урасло.
У словах, справах, ёмкіх і крылатых,
Спяшае за сынамі іх сяло.

Па ходжаных сцяжынках, па нязвычных
Да новай явы, што прыйшла са сноў.
Глядзі, вітае ў вышыні касмічнай
Радзімае гняздо сваіх сыноў.

2011

## ПОЛЫМЯ

Не стоміцца глядзець на працу вока,
На бег вады, на полымя кастроў.
Гартуе лёс, жыццё ракой шырокай
Па плыні нас нясе пад гул вятроў.

Прыступкі палымяныя мы лічым
З пары дзіцячай. Першая з іх – печ.
Здаецца, на чарэнь і сёння кліча,
Галоўная ў сялянскай хаце рэч.

Душа яе цагляная святкуе,
У коміне ад радасці гудзе.
Не кожны ношу на сябе такую –
Сагрэць і накарміць – яшчэ ўскладзе.

Кіпяць агнём бярозавыя дровы.
Надзьмуліся ад шчасця чыгункі:
У полымі, пражэрным і барвовым,
Схавалі важна гладкія бакі.

Хаўруснікі галоўнаю персонай
У печы ўсёй назначылі сябе.
Цяпер па іх высокаму закону
Гарэць астатняй трэба драбязе.

Не стала печ з мурзатымі спрачацца,
Хто нумар першы ў вогненным віры.
Чыгун з варэйкаю не хоча знацца,
Хаця пякуцца на адным жары.

А нас пад дахам дзесяць, роўным лікам:
Бабуль, бацькоў, дзяцей. Зусім малых,
Хто не ўяўляў агонь вялікім ліхам
І верыў шчыра ў цуд кастроў начных.

Сусед мне ўслед глядзеў з такім дакорам:
Я ехаў на начлег і коней гнаў.
Другому выпадаў і большы гонар –
Ён вогнішча да самых зор расклаў.

Галопам праз туманы мы ляцелі
На конях – нашых марах-скакунах.
Ад шчасця доўга іскры зіхацелі
У смелых і даверлівых вачах.

Касцёр, пад горны, клікаў – піянерскі.
Пасля адкрыўся новы далягляд –
Там пад гітару ля агню на ўзлеску
Спяваў наш камсамольскі будатрад.

Здаралася, душа гарэла ў скрусе,
Калі закрыў Чарнобыль небасхіл,
Калі надзейны сябра здрадзіць мусіў,
Другі ж трымаўся да апошніх сіл.

У полымі пакут, баёў, пажараў
Мой край сапраўдных страціў шмат дзяцей.
Удзячныя патомкі тым ахвярам
Нашчадкам данясуць святло надзей.

Яно, бы мова, крочыць разам з намі:
Не кволаму, сляпому – павадыр.
Прывольнай песняй, складзенай сынамі,
Вядзе, як палымяны правадыр.

Усё жыццё, Радзіма, палымнее
У сэрцы слова, родны вобраз твой:
Садоў над Ліпай белая завея
І ўспенены ў даёнцы сырадой.

2010

***

Людзі злом поўняць дом наш няўхільна –
На апошнім стаім рубяжы.
Крэматорыі зноў стануць пільна
Свет дзяліць на сваіх і чужых.

2011

ХРЭСНЫ ХОД

> Скрозь прыдарожны пыл гарыць маліна,
> А рускі шлях усё далей вядзе.
> Расія, ты – багатая краіна,
> Чаму ж багата бедных тут людзей?

Цярністай дарогай з царквою
Русь крочыць пад ветрам нягод.
Пад чэрвеньскай спёкай-канвоем
Праводзяць святую з варот.

Сабралі званы ў наваколлі
Набожных забітай зямлі.
За шчасцем, за лепшаю доляй
З іконай натоўпам пайшлі.

Скрыжалі расійскага лёсу –
Спагады шукае матыў:
З харугвамі ход пад адкосам
У Курскай губерні застыў.

У неба плывуць слупы пылу,
Малітвы, пакора, праклён.
Багатыя, бедны, сляпыя –
З надзеяй ствараюць паклон.

Здаровы – каб сілы не страціць
Да часу, каб доўгім быў век.
А кволы – раптоўна пашчасціць,
Адрынуць хваробы навек.

Гарбун тут, пясчынка падзеі,
Якая пад грузам падкоў
Прад лікам у свет чарадзейны
Кульгае з нязбыўшыхся сноў.

Сярод небарак і заможных
Я продка спрабую пазнаць.
Малюнак стракаты, трывожны,
І пні на пагорку стаяць.

Ураднік няўрымслівы вельмі...
Не з нашай і ён паласы:
Дзядуля – з сялян беззямельных,
А маці расціла лясы.

Маўклівае дзікае поле –
Квітнеючы сад у душы.
Садоўнік, шкада, з наваколля
Забавіўся на кірмашы.

А паства няўтомная ў промнях.
Жар-гузікі, рызы гараць.
Блукаю між пнёў, бы паломнік,
Вакол – праваслаўная раць.

Жыццё наш сюжэт закруціла,
Яно – адмысловы мастак.
Далёкай часіны карціна,
Цяпер не пазнаць той бальшак.

У лапцях, у лакавых ботах
Пыліў па прасёлку народ.
І вось праз стагоддзі з камфортам
Вязуць па шашы хрэсны ход.

Карэнная пустынь, спатканне…
Прыстанак знаходкі святой
Да восені ўсе спадзяванні
Напоўніць жывою вадой.

Шлях рускі – адны запытанні,
Скрозь цэрквы, званоў галасы.
Ці варты чаго пакаянні,
Дзе ўпотай пілуюць лясы?

А спрэчкі кругом не сціхаюць:
Маўляў, не туды нас вялі.
Не сівер, Свірыдаў спяваюць
Над горадам і салаўі.

З крыніц жыватворных Айчыны
І душаў, і ўчынкаў узлёт.
Сляпенькі агеньчык лучыны
Аднойчы распаліць усход.

2010

***

Я новых шляхоў не шукаю.
Дарогі знаходзяць цябе:
Прастора ад краю да краю,
І ты на кані кожны дзень.

2011

КАЎКАЗСКІЯ МАТЫВЫ

Вітае Гагра сонечным настроем –
Паміж гарамі церам і вадой.
Курорт калісь элітнага пастою,
Цяпер трывога наша, неспакой.

Цясніны, горы дзіўныя без краю,
Ля мора – рай, а на душы – зіма.
Дзесь музыка вясёлая іграе,
Але ўрачыстасці самой няма.

Наводзяць сум пустыя аканіцы
Разбітых здраўніц, спаленых дамоў.
І тут спрабуюць госці пасяліцца,
Знаходка для сапраўдных «дзікуноў».

Як і раней, сюды на адпачынак
Саюз па звычцы едзе загараць.
На пазбярэжжы знешне ладам, чынна,
Сабакі толькі ля вады ляжаць.

Афон тут Новы, а прыход ранейшы,
Храм для набожных – бы ў начы маяк.
За тымі вера, праўда, хто мацнейшы,
На рэйдзе вахту наш нясе марак.

Я паўналецце святкаваў на Рыцы:
Які мажорны выдаўся маршрут.
Ці мог падумаць я, што навальніцы
У край братоў нашлюць дажджы пакут.

З якіх арбіт сышла бяда пад шаты?
Хто зрушыў гнеў за тысячай замкоў
І абурыў на горы жах касматы,
Каб кут квітнеючы пабачыў кроў?

Калі палае дом, не да сабакі.
Гаспадары пакінулі сяброў.
Хто кінуўся на ўцёкі, небарака,
Другі ў баі загінуў за звяроў.

Аблічча ў поўсці: ні манер, ні злосці,
Глядзіць з вачэй патушаных дакор.
Тут нават лепшыя на свеце косці
Не вернуць да сабак былы задор.

Не зблытаеш паходжанне – з пароды,
У іх усё напісана на лбе.
Абвіслыя ляжаць на лапах морды,
Плывуць маўкліва па сваёй журбе.

Сум у вачах, згас нораў забіякі.
Што здрадзілі – ніякай іх віны.
Абхазскія бяздомныя сабакі –
Аскал каўказскай,
                    на ўвесь свет, вайны.

2010

***

На ганку дома моўчкі азірнуся
У далячынь пракладзеных гадоў.
Дадолу нізка людзям пакланюся,
Хто роднасць падзяляў, са мной ішоў.

2011

## СЦЯНА ПЛАЧУ

> Невялічкі кавалак жыцця
> У Сінайскай пустыні згубіўся.
> У пячоры галосіць дзіця –
> Віфлеемскі вяшчун нарадзіўся.

Перад часам мы роўныя ўсе,
Незалежна ад веры і мовы.
З-пад Разані па золкай расе
Пачынаўся твой шлях каляровы.

Бацька згінуў да часу ў віне.
Брат з афганскай вайны не вярнуўся.
Толькі ліха хто дзе памяне,
І адразу ж – рэформы з прымусам.

Медыцынай даступнай звялі
У нябыт мужа жах-эскулапы.
А табе далі шанц – адвялі
Смерці жудаснай ліпкія лапы.

З рускай маці чыноўная раць
Не спыняе бясконцыя войны:
То кватэру спрабуе адняць,
То рэкламай гняце непрыстойнай.

У дзяцей жыццё – клас і адстой,
Ім адценні пакуль невядомы.
Перамогі святочны настрой
Іншы раз прачынаецца ў доме.

Маці руская – статус жанчын,
Жорсткі быт расшчапіўшых па спектру:
Колер сонечны ў дом зачыні,
Фарбы горычы – прэч па праспекту.

Каменістай сцяжынкай ішла
Пад цяжарам турбот і нягоды.
Хоць у лукаткі, ды да святла
Дацягнулася праз перашкоды.

Над спакусамі ўзвёўшы масты,
Свае вокны расчыніш аднойчы
На вячэрнія плошчы Масквы,
Дзе бясконцыя белыя ночы.

Як даніну з пакораных дзён,
Ты па пацерцы шчасце збірала.
Праз пустыню прыйшла на паклон
Да сцяны, што тут Храмам стаяла.

Запаветныя думкі сюды
Нясуць людзі з надзеяй на цуды:
На збавенне ад здзеку, бяды;
На заможны маршрут і славуты.

Што зрабіць, каб ад нас адвялі
Жах, абразы, падманы, хваробы…
Сцяной плачу стаяць камяні,
Там запіскі – ад бед засцярога.

Шлях Хрыста на Галгофу прайшла.
Ля Госпадняй труны на каленях
У душы свайго Бога знайшла,
Што сказаць яму – у задуменні.

Ад каго абароны прасіць?
Ад чаго трэба перш засланіцца?
Як багата на сэрцы кіпіць,
Ды дазволена раз заступіцца.

Столькі болю ў цыдулку адну?
Невялічкі кавалак паперы…
Яго згорнеш і – прама ў сцяну,
Ёй Госпадзь тайны лёсаў даверыў.

Бачыш, шчыліны ўсе занялі.
Быццам слёзы Зямлі тут сабралі.
Змацавалі яны ў маналіт
Камяні, што сцяною паўсталі.

Запаветныя мары жывуць
Неспакоем для вечных каменняў.
Іх у неба няспынна нясуць
Сведкі міру, вайны, адраджэння.

Рэдкі бонус, на дзіва, ён твой.
Раз-другі так шанцуе, насілу.
І ты пішаш дрыжачай рукой:
«Захавай, Святы Божа, Расію».

2010

***

Мы малую радзіму, адну,
На вялікую з часам мяняем.
Як бы нас вецер лёсу не гнуў,
З малой роднасці мы не губляем.

2010

АЎТАБАН

Аўтабан стэп прарэзаў стралою,
З лука пушчанай за гарызонт.
Гнуцца ўдзячна палынам-травою
Аксакалы ўсіх часавых зон.

У здзіўленні быліны сівыя.
Хуткі бег для іх – песня душы.
За плячыма шляхі векавыя,
Іх качэўнікі сціпла прайшлі.

А насустрач – чырвоныя макі,
Зноў палае вясенні пажар.
У пагоні бясконцай сайгакі
Неўзабаве абгоняць сам шар.

Падаліся мне ў марыве юрты,
Для качэўнікаў – дом і жыллё.
І якім бы казах ні быў мудрым,
Без каня быт заглушыць быльнёг.

Людзі стэпам пранеслі стагоддзі.
І ў далёкія дні, і цяпер
Паслухмяны пад імі паводдзю
Легендарны скакун Кулагер.

Увянчалі прызы не ўсе скачкі.
Марна ў тратах гарэлі гады,
Калі везлі ў вагонах цялячых
На чужыну  жанок маладых.

Муж у кожнай быў вораг народа,
Не прыдумаць абразы бальней.
Праз сіроцкія слёзы, нягоды
Стэпам крочылі людзі далей.

З рэпрадуктараў песні пазвалі:
– Цаліну, камсамол, узнімай!
Дол запоўнілі хлебныя хвалі,
І паплыў у Маскву каравай.

Гарады свае назвы мянялі –
У качэўнікаў нельга без змен.
Хаця гены аседласць прызналі,
Патрабуюць усё ж перамен.

Перш Акмолінск стаў Цалінаградам.
«Астана» – пасля назву далі
І абралі высокім царградам
На казахскай прывольнай зямлі.

Па сталіцы няспешна я крочу
І зайздрошчу па-добраму тым,
Хто няспынна так гучна грукоча –
Ставіць новыя нам гарады.

Мова братава мне незнаёма.
Вось каханых вязе лімузін.
Ён пяшчоту казахскага дома
Нясе  ў заўтра з патоку машын.

Думы стэпаў – у споведзі домбры.
Між асфальту сівее палын.
Над Ішымам стаіць нерухома
Вершнік. З чым ты не згодзен, акын?

Час адкажа на ўсе запытанні,
Толькі позна, на нашу бяду.
У граніт берагі закаваны.
Я па трапу на катэр іду.

Гандальер мой – дзяўчына, што сонца,
Загарэлы, абветраны твар.
Дзіця стэпу і я, на маторцы,
Прэзідэнцкі абходзім бульвар.

Узбягаюць у неба паверхі,
Хто б ні глянуў, здзіўляе размах.
За сталіцай з надзеяй і верай
Зорка сочыць з прыжмурам казах.

Час ляціць, з аўтабана не збочыць,
Хоць у краі ён і піянер.
Бачу, стэпам праз дні і праз ночы
Скачку мары вядзе Кулагер.
2010

***

Эпісталярны жанр стаў не ў пашане.
Канверт і марку замяніў дысплей?
На мове эсэмэс нясуць зямляне
Цяпло душы да дарагіх людзей.

Сучасныя тэхналагі сумеюць
Дакладна, хутка перадаць сюжэт.
З пяшчотай – горш, і з пачуццём падзеі:
Як без героя пішаш ты партрэт.

Эпісталярны сказ адстаў ад часу,
Сярэбранага веку вадэвіль.
Ліст без душы, што спеў па пераказу.
А жыў жа тонкі і высокі стыль!

2012

ВЯСЁЛКА НАД ЭЛЬБРУСАМ

З двух кропак-гарадоў планеты нашай,
Дзе дыхаем, працуем мы, жывём,
У трэцюю, за дыетычнай кашай,
Прыехалі. Ваду ў бювеце п’ём.

Есентукі. Курортны парк. Гуляем.
Пра многае хацеў табе сказаць.
Ды слоў няма. Ім месца не хапае.
На твары запаветнае відаць.

Наўкол – блакіт. Вясна датэрмінова
У студзені зачаравала нас.
Алея – нібы ў забыццё прадмова.
Спыніўся разам для абодвух час.

А над курортам – цішыня да неба.
У інтэр’еры – велічны Эльбрус.
Тут што яшчэ для шчасця людзям трэба,
На самы нават далікатны густ?

У промнях па жыцці жанчына крочыць.
Шчаслівы дзень нясе, нібы брыльянт.
Не часта ёй сярод тугі сірочай
Вясёлкі асвятляюць праменад.

Лагодна крадзецца цяпло па твару
Да стомленай рэформамі душы.
Дзесь пасвяцца за гарызонтам хмары.
Спяваюць аглушальна капяжы.

Прачнуліся вавёркі спецыяльна
Сярод зімы ўсяго на дзень адзін,
Каб ад дыхання радаснага рання
Крыху пагрэцца – некалькі гадзін.

Усе жывуць чаканнем карнавала.
Ён, бы вясенні прывід, залунаў.
Курортнікаў, шкада, на свяце мала,
Ім горны від не па кішэні стаў.

Але ж па сродках піць амерыканцу, –
Ён наш, былы, а зараз як бы госць, –
Гаючую ваду, хадзіць на танцы.
Ды непакоіць крэпка яго штось.

Пяшчотных зносін, нават для багатых,
Ніколі людзям не было зашмат.
Але як можна залатыя Штаты
Змяняць на бляск эльбрускіх снежных шат?

Не месца песням у бясконцай гонцы,
Душа даўно забыла іх матыў.
На зеляніну грошай, бы на сонца,
Дыміць яго жыццё-лакаматыў.

Ён да апошніх дзён здзіўляцца будзе –
Як гэта можна так ахвяраваць,
Каб бесклапотна па замерзлым грудзе
І рамантычна з мілаю гуляць.

Чым больш жывеш, тым болей шчасця трэба.
Сардэчных хваляванняў капітал:
Ад роднасці зямной каштоўнасць гэта,
Яна не ўсходзіць паміж чэрствых скал.

Сярод зімы кароткія спатканні,
Маланкамі праносяцца гады.
Зарніцамі ў жыцці гарэць світанні,
Дзе родны чалавек і побач ты.

2011

***

З якіх нячытаных раманаў,
Заснежаных нягодай сноў
Вярэдзіш ты старыя раны,
Дзе колісь гадаваў любоў.

2012

## ПОЗНЯЯ  ВОСЕНЬ

Расступіўся над Волгай туман.
Фарбы жухлыя кружаць з вятрамі.
І асенні плыве караван
Шэрай раніцай над берагамі.

Захаваўся за бліжні лес змрок.
Неба ў вочы пахмура глядзіць.
І дарэмна шукае мой зрок,
Як у вырай клін позні ляціць.

Пад нагамі ліст жоўты дрыжыць
Успамінам спякотнага лета.
На маністах рабіны гарыць
Салаўіны раманс недапеты.

Хмары рэжа халодны прамень,
Тыя плачуць ад болю дажджамі.
І натужна так цягнецца дзень,
Прыкаваны да луж ланцугамі.

2010

***

Я зайздрошчу ўвесь час лімузінам,
Белым-белым вяршыням жыцця,
На якіх урачыста і чынна
Шлюб нясе пераможна свой сцяг.

2010

СНЕГАВАРОТ

Каторы дзень снег сыпле на Казань.
У гурбах плошчы, вуліцы, бульвары.
Нярвуе мэр – званкамі будзіць рань:
Занесены ж дарогі, тратуары.

Пад белай коўдрай зданямі ляжаць
Час старажытны, сённяшняя ява.
Звыш тысячы гадоў тут нараджаць
Завеі прылятае сцюжа-пава.

У снежнай каруселі затануў
Найкарацейшы дзень у гэтым годзе.
А завіруха ўсё слату адну
Нясе: лютуе – толькі б больш нашкодзіць.

Са свістам гоніць золкую імжу,
У шыбы б’ецца віхарам, у твары.
Спрабуе Крэмль схаваць пад паранджу,
Міленіум – у снегавыя мары.

Сюіта снежная згубіла такт,
У разнабой нясуцца галасы.
І спадзявацца цяжка на антракт.
Зіма балюе – верх яе красы.

Гудзяць і рвуцца струны-правады,
Не вытрымалі свята снегападу.
Яны звінелі ўсцяж на ўсе лады
І дагуліся, бач, да заняпаду.

Казань на дол заснежаны глядзіць
З вышэйшага ў Еўропе мінарэта.
Ну колькі можна ўсё зіме гадзіць,
Забыўшы лепшыя манеры свету?

Каторы час мяцеліца мяце.
Бязлітасна заносіць горад снегам.
Па гурбах накрухмаленых ідзе
Чырвонашчокі дзень з дзіцячым смехам.

Пурга спыніла ў ноч снегаварот.
Пад промнямі іскрыцца наваколле.
Спрабуе звесці з розуму народ
Цяпер зіма карункамі застолля.

Фатой вясельнай гарадскі пейзаж
Раскошу баласнежную прымераў.
І рамантычна так  яе вітраж
Схаваў заторы, слізкія бар’еры.

2011

## *КУЛІКОВА ПОЛЕ*

НАЧНЫ РЭЙС

Я з грузам клопатаў прывычных
І сумкай неадкладных спраў
Спяшаю на таксі сталічным
У порт паветраных адпраў.

Адсюль на крылах самалётаў
Па самай тонкай паласе
Зямляне крочаць у палёты,
Нібы на золку па расе.

Наш рэйс часова затрымалі.
Гляджу на шыбу я: адкуль
Заводзіць месячык у залу
Багіню-зорку за руку.

Не я адзін, усе ў здзіўленні.
Бывае ж цуд такі ўначы.
А зорка – скок на стул суседні,
Вядзём размову ні аб чым.

З якой галактыкі ты будзеш?
А што, ёсць і Стары Арбат?
А беларусы? Гэта людзі,
Іх лёс, жыццё – высокі гарт.

Бацькі і дзеці? Ім спрадвеку
Радней нікога не знайсці.
А колькі трэба чалавеку
Дарог да ісціны прайсці?

Калі трымаць маршрут з цяплушкі…
А дзе арбіты маладых?
Дакуль з бабулінай царквушкі
Ім несці крыжык з рук святых?

Бацькоўскі быт патрыярхальны
Высокай нотаю жыве
У дзецях, быццам гімн світальны,
Штодзень за небакрай заве.

Там, бачу, Месяц абступілі.
Пытанняў многа, ён – адзін.
Без хлеба людзі што б рабілі?
Хто корміць свет? Ды селянін.

Аб чым пяюць у небе пташкі?
А як канчаецца жыццё?
Для вольных траў – пад звон мянташкі.
Прарокаў – гоняць на касцёр.

Трывожны сон парушыў хтосьці –
На рэйс пасадку пачалі.
Пайшлі ў начное неба госці,
Бягуць узлётныя агні.

І дзесь пад Гомелем дубравы
Таксама ў позні час не спяць.
Куды ляціць зямляк, цікава,
Што хоча ў зорак распытаць?

Хвалюецца мая радзіма.
Як многа на душы трывог:
За памяць аб сівых часінах,
З Сусветам шчыры дыялог.

А я лячу пад гул турбінаў
І сэрца асцярожны стук
Для роднай мовы ў Палесціну
Шукаць нястомна новы гук.

2009

***

Лес схіліўся пад снежнаю коўдрай,
Ледзяны на галінках крышталь.
Вецер носіцца з белаю мордай –
Закружылі з мяцеліцай баль.

2012

ЛЕДЗЯНЫ ДОМ

Лічаць летнія страты канторы,
А ўжо снежань лютуе кругом.
На палаўшыя ў жніўні прасторы
Ледзяным ён разліўся дажджом.

Сама шчодрасць сцюдзёная кухня:
– Вам завея, мароз? Хоць вагон!
У віхурах мяцеліцы тухне
Астудзіўшы душу сумны звон.

Дрэвы сцелюцца долу ў пакутах
Пад цяжарам ільду і снягоў.
І няма дзе шукаць паратунку
Ад сякеры глухіх крышталёў.

На шашу сосны падаюць з плачам,
На слупы электрычных апор.
Трасы з вахты сыходзяць звышзначнай –
Пад ільдом наступае затор.

Верхавіны ляцяць долу, голле,
Набірае стыхія кураж.
Стогнам лес напужаў наваколле.
Як чароўны – трагічны пейзаж…

Ля акна на прыстуджанай дачы
Я сяджу без цяпла і агню
І, рашыўшы з рэформай задачы,
Салам соек і дзятлаў кармлю.

Па ранжыру чарга ля кармушкі,
Для крылатых галоўнае – корм.
З-за яго асцярожныя птушкі
Пакідаюць у пушчы свой дом.

Завіруха стукоча мне ў браму,
Голіць твар ледзяны дабрадзей.
Разгулялася снежная драма
Для прыроды, улады, людзей.

Які тыдзень само Падмаскоўе,
Нібы ў склепе пячорным жыве.
Трэба выйсці з якога саслоўя,
Каб так казачна шкодзіць сабе?

Па прастуджанай рускай прасторы
Цягнік хуткі шыбуе ў імжу.
Знаць, не ўсе яшчэ збіты апоры
І не ўвесь дрот сышоў на іржу.

Гвалт і рогат – бы вецер сустрэчны.
Першародства прадаўшы, краты
Сачавічную поліўку хлебчуць –
Час для блазна настаў залаты.

2012

***

Парваў неба клін жураўліны.
У дзень новы сонца пайшло.
Скрозь цемру вядзе шлях птушыны,
Сталее ў палёце крыло.

2012

## ЧУЖАЯ КАРЫСЦЬ

Адспявала лета, адзвінела,
Залатая восень тчэ пейзаж.
Яшчэ ўчора маладое цела
Сёння не бярэ круты віраж.

Набываем мудрасць мы з гадамі,
Доўгі шлях да ісціны вядзе.
А спакус, што кружацца над намі,
Не шкадуе сыты дабрадзей.

Нікацін, наркотыкі, гарэлка –
На карысць чужую бавім час.
На гадзінніку жыццёвым стрэлка
Бессаромна траціць наш запас.

Дзень за днём гады свае транжырым,
Розум, сілы смокча ліхадзей.
А пасля ў атручаныя жылы
Хочам новых сонечных надзей.

Аб здароўі час паклапаціцца,
Але рукі, ногі так дрыжаць.
Сон кашмарны доўга будзе сніцца –
Ты курыць паспрабаваў кідаць.

Лад жыцця свядомы – нож у сэрца
Гандлярам пакут і злых начэй.
Толькі б не спазніўся ты сагрэцца
Ля шчаслівых маміных вачэй.

2012

***

Ну колькі можна піць і зводзіць ежу?
Прыходзіць час падумаць аб душы
І нагадаць, што да людзей належаш.
Цяпер далей мазгамі варушы.

2011

## ЧАРАЎНІЦА

Жаўрукі пад прасцягам блакіту
Будзяць край гімнам новай вясны.
На палаці адправіў дзед світку.
Нагадаў лямеш смак баразны.

Зноў ралля гарызонт падпірае.
Зерне ў пухклую глебу лягло.
Майскі дождж – добры знак.
З ураджаем
будзе сёлета наша сяло.

За ваколіцай гул не сціхае,
Трактарысты – народ баявы.
Хай гармонік крыху пачакае,
Цэлы год корміць дзень веснавы.

На сяўбе трактар мой натаміўся.
А даярка не стане чакаць.
Пад вянец з ёю кожны б згадзіўся,
Сам іду чараўніцу страчаць.

Распарадак на ферме дакладны –
Па гадзінніку дояць кароў.
Здаля чуюцца дойкі рулады
У суквецці вясенніх званоў.

Па сцяжынцы пад небам вячэрнім
Так загадкава постаць плыве.
Незямное застыла імгненне –
Рукі леглі на плечы твае.

Без музыкі акруга спявае.
Свет квітнее: душа і зямля.
Я ў шаўковай кашулі ад мая –
Быццам ветразь твайго карабля.

Пах чаромхі дурманіць, віруе.
Тоне ў водары спеў салаўёў.
Мы з каханкай у зор вечаруем
Паміж небам і марай палёў.

Дзень працоўны даўно спачывае.
Няма стомы гадам маладым.
Яны крочаць ад мая да мая,
Шлях якім бы не выпаў крутым.

2012

***

Пах лета са збожжам скасілі.
Гарацць дні з абодвух канцоў.
Чырвоная восень Расіі –
Маё залатое кальцо.

2012

ПЛЁС

Рака выплывае з туману.
Ля ног хвалі гушкаюць плёск.
Запаў у душу Левітана
Пакуль невядомы ўсім Плёс.

На бераг круты стаў дамамі.
Далез да вяршыні гары.
У неба глядзяць купаламі
Набожнай зямлі жыхары.

Быў горад звычайнага лёсу,
Глыбінка расійскіх падзей.
На варце спакою – бярозы.
Яшчэ вось мастак-чарадзей.

Рака яго сэрца кранула
Мелодыяй скрыпу вясла.
Душа сярод ніў патанула
І краскамі лугу ўзышла.

У неба да зор на спатканне
Па месячнай сцежцы хадзіў.
Пад ціхія песні світанні
Над Волгай з сябрамі будзіў.

І пэндзаль не ведаў спакою,
Ім талент, натхненне вялі.
Прасторы над рускай ракою
Па свету ўсяму паплылі.

На зайздрасць майстэрня пад небам:
Мальберт і на выбар – вітраж.
Паломнікаў соллю і хлебам
Вітае прыволжскі міраж.

Ідуць параходы няўтомна,
Еўропа спяшае ў музей:
Спачатку – да плёскіх палотнаў,
Пасля можна і ў Калізей.

Карціны – паэзія часу.
Не знойдзеш паблізу пейзаж,
Які б не пазіраваў майстру.
Над Волгай – жывы вернісаж.

Кальцо залатое Расіі –
Душа і натхненне яе.
Каб песні палёту прасілі,
Плёс вахту прыгожа нясе.

2010

***

Да зместу розум прагне
Праз страх і перашкоды,
Жыццё да зорак цягне,
Герояў і народы.

2010

КУЛІКОВА ПОЛЕ

«На Саўгасную вуліцу» – выхад.
Прачытаў я падказку ў метро.
Нечакана цяжкі зрабіў выдах,
Пайшлі кадры старога кіно.

Вёску з назвай Саўгасная бачу:
Прыпадняўшы ад ветру каўнер,
Круглы год з ураджаем задачу
Вырашае па формуле ферм.

Над ракою вяскоўцаў сядзібы,
А вакол – хлебнай нівы абшар.
Сціплы быт ля дарогі разбітай,
Пакасіўся саўгасны амбар.

Множыў край свае конскія сілы,
Абудзілі прастор трактары.
На машынах мы жалі, касілі.
Колькі часу прайшло з той пары?

Беларускае роднае поле.
На далонях тваіх каласы
І дзядулі сялянская доля,
Гоні ўзлётнай маёй паласы.

Адсюль бачыў тэатры малыя,
На Вялікі глядзеў спакваля.
Тут у травы хадзіў лугавыя,
Каб пачуць, як спявае зямля.

Мне казалі, што трэба баяцца
Недарэчных жаданняў сваіх,
Бо яны часта могуць збывацца,
І тады не стрымаць ужо іх.

З вёскі, вечна склапочанай, наскай,
Я за марай упарта ішоў.
У Берліне на оперы пляскаў,
З Марыінкай быў пяць вечароў.

У Вялікі прыйшоў на прэм’еру:
Які цуд – апельсінавы рай.
Відаць дзея выдатна з партэра,
А за ёю – бярозавы гай.

Наш, над вёскай, што радуе думы,
Асалода душы і вачэй.
Тут, расклаўшы на беразе вуды,
Слухаў я, як Чачора цячэ.

Сёння песні гучаць на лад новы.
Конь на лузе мой здаў ад нуды.
Ды трымаюцца моцна падковы,
Прылятай, пойдзем браць гарады.

У метро пакуль вёз успаміны,
Зачакаўся скакун пад акном.
Асядлаць яго – справ на хвіліну.
Па Маскве я гарцую вярхом.

Нам дваім – прызавая дарога,
Хоць машыны, заторы кругом.
Калі зморыць ад смагі гнядога,
Напаю я ў фантане яго.

Мы стаялі, стаім, стаяць будзем.
Прэч ляці вараннё з курганоў!
Шле па думках і справах у людзі
Беларуская ніва сыноў.

Яна – поле маё Кулікова.
І тады, і цяпер, і заўжды
Тут сумленне і матчына слова
Вывяраюць наш шлях праз гады.

Родны кут, пад тваім небасхілам
Мне з маленства да суднага дня
Чэрпаць сталасць для мовы і сілы.
І не скончыцца песня мая.

2011

***

Узыходзіць агністаю птушкай
Новы дзень для цябе і мяне.
Асцярожней! Планету не гушкай.
Мы і так выйшлі ў шторм на чаўне.

2012

ВЯТРАК

Цэлы век імкнецца ў неба млын,
З сіл апошніх тужыцца вятрак.
У палёт благаславіў сам тын,
Не згаджаецца пакуль бальшак.

Свой прапелер ветразем узняў
Супраць ветру над усім сялом.
І з жарон плыве мука штодня –
Не дарэмна ж вецер рваць крылом.

2011

***

Чалавек, колькі помняць гады,
Не спыняў на сваіх паляванне.
Рушыў храмы, паліў гарады,
На руінах шукаў даравання.

2011

СПАКУСА

Гадам маім цесна
У звыклай кватэры.
Бясконца – пратэсты,
І рвуцца за дзверы.

Як толькі дазволю
У шлях адпраўляцца,
Імгненна – на волю,
За цугам не ўгнацца.

Нясуць па дарозе
За край небасхілу.
У нашым абозе –
Дзе змест, там і сіла.

Нас песні чужыя
Спяваць не прымусіць.
Нам словы б жывыя
Пабачыць. Спакусіць.

2011

***

Нарастае крытычная маса.
Звар’яцела ад смеху Зямля.
І не бачыць за брыдкай грымасай,
Што на судне плывуць без руля.

2010

## СВЯТЛО Ў АКЕНЦЫ

Мы – цуд прыроды, казачная дзея.
Расклад найфантастычнейшы ў лато,
Калі табе ў жыццё адчыняць дзверы
І пададуць, на выбар, паліто.

Гэта тваё шчаслівае імгненне,
Няма важней падзеі на Зямлі.
І панясло глыбокае цячэнне,
Стаў ветразі і на святло плыві.

Прырода-маці верыць, спадзяецца,
Што ты – знаходка, волат, адкрыццё.
І з хваляваннем сочыць праз акенца,
Які ты ўзор кладзеш ёй у шыццё.

2012

***

На карце сцерлі твар краіны роднай –
Светапарадак не дазволіў жыць.
Назначыў матчын дом турмой народаў,
Адняў усё, чым можна даражыць.

2010

# *КАРЭЛЬСКІ ПАЦАЛУНАК*

## ПРАГРЭС

Матор па хвалях мчыцца
З усіх японскіх сіл.
Да чаек далучыцца
Хачу я ў небасхіл.

За шырму белай ночы
Сярод азёр і рэк
У водпуск толькі збочыў –
Згубіўся чалавек.

Не астывае лазня,
На беразе дыміць.
З парыльні б ні вылазіў,
Ды юшка ўжо кіпіць.

З палка – у Водлу прама,
Пад вокнамі цячэ.
Рака – калодзеж, пральня,
Бальшак, садок яшчэ.

Лешч на патэльні ладны,
З уласнай поймы ўлоў.
Частуюць госця знатна –
Сцякае смак з вусоў.

Як толькі дагарае
Мой адмысловы дзень,
Зара другі страчае
У полымі надзей.

Фарэлевыя тоні,
Лясоў глухіх сцяна.
Не гасне ў іх палоне
Толькі зара адна.

Яна, хіба, гадзінку
У пушчы адпачне
І залатой хусцінкай
Зноў горнецца ка мне.

У каляровай стоме
Гарыць нябесны край.
Сніць цуд у ложку ў доме?
Не, сябра, прабачай.

Іду я ў звон агністы,
У бляск адборных рос.
На востраве імшыстым
З сасной у скалы ўрос.

Блакітны гожы ранак
Над возерам плыве.
Фарбуе даль старанна:
Аблокі ў сіняве.

Гляджу: у небе хвалі,
Ні то яно ў вадзе…
На стол сняданак далі,
Пачаўся новы дзень.

Стаіць пасёлак Шальскі,
За тынам – стромкі лес.
Да першародных даляў
Згубіў шляхі прагрэс.

Ці добры факт, ці дрэнны?
Як на яго глядзець:
Калі прагрэс сумленны,
З ім можна справу мець.

2011

## ЛІСТ ДА СЯБРА

Віктару Казлову,
грамадзяніну і міністру

Адклаў у бок усе рашуча справы,
Жыццёвыя малюнкі варушу:
Пад Глазаўкай – лён коўдраю сінявай…
Да сябра я ў Карэлію пішу.

Быў старшынёй калгаса ў Беларусі.
Рэкордамі палёў і фермаў жыў.
За пералік іх нават не бяруся,
Так да міністра потым даслужыў.

Усё за нас гісторыя раскажа,
Мне больш дадаць няма чаго ў радкі.
Яна па днях дакладна шлях пакажа,
Дзесь там чуваць буднецкія гудкі.

Наўкола лес. Мароз. У зорках неба.
А пасярод планеты – мы з табой.
Не ведаю, якая ў тым патрэба, –
Касцёр наш цемру рве над галавой.

У полымі згараюць космы ночы.
Да зорак палыхаюць языкі.
А там па рэйках коламі грукочуць –
Праз Млечны Шлях шыбуюць цягнікі.

Яны зямныя планы нашы неслі:
Пабудаваць дарогі праз сяло,
Вяскоўцам даць заможна жыць пад песні,
Іх дзецям – стаць трывала на крыло.

З табою мы, нібы Дзяды Марозы,
Галактыкамі хочам сябраваць.
Гаворым дзесьці жартам, дзесь сур’ёзна:
"З фантасмагорый трэба пачынаць

Шукаць шляхі да ісціны і зорак,
Да першароднасці сваёй зямной".
Ды верылі не нам. І мы пад сорак
У новы дзень пакрочылі з Масквой.

Няма краіны той, адкуль мы родам.
Святло і цемра – іх не распазнаць.
Але абодва мы душой з народам,
І рана на запечку спачываць.

Я часам тую ноч, ды нагадаю.
Прызнацца, не ўспамінамі жыву:
Як і раней, настойліва шукаю,
Што роднiць лён і неба сіняву.

Снягурак нашых дні не шкадавалі,
На тварах мілых склаліся ў гады.
Памылкі ні адной не даравалі.
І мы – ужо сапраўдныя дзяды.

Нам выдалі святы мандат унукі.
Шчаслівым званнем – як не даражыць!
Не кожнаму такія падарункі,
Патрэбна мудрасць, каб да іх дажыць.

Усе расстаўлены, здаецца, кропкі.
Вось праўнукаў нам дзеці прынясуць.
Хай ціснуць рэжысёры свае кнопкі –
Нас з бальшака нікому не звярнуць.

Фармальна мы здалі з табою вахту.
Але на сэрцы груз віны ляжыць.
Радзіме людзі служаць не па фрахту.
Бацькоўскі дом – дзе нашым дзецям жыць.

2011

КАРЭЛЬСКІ ПАЦАЛУНАК

Шэрая ружа –
Сімвал Парыжа.
Коціцца сцюжа –
Як кветцы выжыць?

**Паўночны вецер**

На беразе бясстрасна
Чытаюць хвалі сціх
Аб чорнай ружы, шчасці,
Якое на дваіх.

Дрыжыць пад стылым ветрам
Настуджаны блакіт.
Плыве над парапетам
Паўночны краявід.

Петразаводск на бераг
З халоднай сінявы
Сышоў у фарбах шэрых,
Характар баявы.

На рускім парубежжы,
Сусед дзе дакучаў,
Слуп пагранічны вежай
Стаіць, жыцця прычал.

Над скаламі, над часам,
Над тайнамі былін,
Над азяровым краем,
Пад песнямі ялін.

Узняўся над планетай,
Рос, набіраў хаду.
Шырокія праспекты
Збягаюць у ваду.

Паўночнае паветра,
Мой вяцкі беларус,
У твар табе б’е ветрам,
На хвалі верне курс.

**Чорная ружа**

Адкрыта ў лёс твой брама
Карэльскім пацалункам.
Ляжаць на скронях сябра
Яго дарог карункі.

Як хутка бегла лета
На сінім узбярэжжы.
Ляцела ўслед "Камета",
Адстала на Анежжы.

Паўночны вецер колкі
Працяў людзей, палеткі.
Асенні подых золкі
Крадзе скупыя  кветкі.

Звініць кавадлам молат,
Ля самых хваль штукуе.
Петразаводску волат
Узорны дар майструе.

Над чорнай ружай доўга
Каваль-брат завіхаўся.
Пялёсткі сплёў любоўна,
З шыпоў бутон прарваўся.

З характарам ружовым
Сталёвая какетка.
На беразе суровым
Глядзіцца міла кветка.

Наперакор марозам,
Халодным летнім ранкам,
Усім ліхім прагнозам,
Снягам, дажджам, маланкам.

Час развітання блізка,
Змятае сцюжа лета.
Я п’ю нагбом, бы з міскі,
Брутальнае паветра.

Над Шуяй светлы церам,
На ўскрайку белай ночы,
Ты склаў з адной сякерай
Пад гул вятроў паўночных.

**Карэлія**

Трывожным рускім лёсам
Жыве карэльскі лес.
Зялёныя палосы
Скрадаюць скальны змест.

Крапчэй за сталь бярозы,
Мядзведжыя куты…
Калі глядзець цвяроза,
То край тут залаты.

Ён фаунай і флорай
Багаты сапраўды.
Не раз лясоў прастора
Масціла шлях з бяды.

Не хопіць фарбаў свету
Палітру перадаць
Жыцця святой планеты.
Ды ёсць аб чым сказаць…

Малітвы Валаама,
Драўляны сказ Кіжоў.
Плыве праз памяць драма
Астрога-Салаўкоў.

Лясоў густых суровасць.
Блакітны спеў затон:
То ў іх зары барвовасць,
То белай ночы сон.

Фарэлевая завадзь
Расійскіх рыбакоў.
Яшчэ дол тайнай вабіць,
Схаваўшай код вякоў.

а камянях-цыдулках
З лясістых берагоў
Нам прашчур шле ў малюнках
Легенды тых гадоў.

Вадою марцыяльнай,
ВясёлкайКівача,
Не знойдзенай каханай
Мне бачышся ў вачах.

І шмат вакол гусарства,
У лад хлуслівых слоў.
Крыху б лясному царству –
На фінскі крой абноў.

Імперыі задворак,
А выбіўся ж у свет!
Разгроб усе заторы,
Не мець бы іншых бед.

Крыж стаў на парубежжы
У памяць горкіх страт.
Спрачацца нам за межы –
Не па-суседску, брат.

Разводзіць крыж рукамі:
– Ці з праўдай вы жылі?
Да шчасця код з сябрамі
Шукаюць на зямлі.

2011

ЗОНА АДЧУЖЭННЯ
Паэма

**Спатканне**
Званочкам першае каханне
Ля школьных веснічках звініць.
Быў час, набат будзіў світанні.
Жыццё жар-птушкаю ляціць.

Маршрут раз выбраны зайздросны:
За даляглядам – далягляд.
Згараюць у натхненні вёсны,
Каб радаваў асенні сад.

Ад смагі ў роце перасохла.
Вады б глыток з сяброўскіх рук.
Мой паратунак – звычны посах,
І ў новы шлях пад колаў стук.

Туды, дзе зведзены прыматы
І дзе не стануць жартаваць,
Калі ў руках трымаюць атам,
А побач людзі мірна спяць.

Замкнёны дом, дзе не чакалі.
Сам гаспадар гасцюе тут.
Усім – чужынец, не прызналі.
Паклон ад сына, родны кут!

Слоў для падзякі не шукаю.
Да болю мілы краявід.
З табой былое прыгадаю,
Хай адпачне крыху транзіт.

Нагбом, бы вар той, п’ю ўспаміны.
Спатканне з бацькаўшчынай мне:
Нясе бабуля чай з малінай,
Узор марозны на акне.

**Ад вясны да вясны**
Зелянінай ліпучых пупышак
Салютуе вясне красавік.
Не знайсці пад блакітам зацішак,
Дзе б яго не прайшоў чаравік.

Вясна ў небе, лясах і на полі
Гаспадарыць, штукарыць, цвіце.
Гарады, вёскі і наваколле
У чароўнай плывуць немаце.

Ажыла, абудзілася ніва,
Яшчэ ўчора ў палоне снягоў.
Дзень і ноч раўчукі гаманліва
Вызвалялі палі ад акоў.

У вясёлкавых фарбах і кветках
Беларускі вясенні пейзаж.
Пазабыўшы заморскія клеткі,
Птушкі дома расклалі багаж.

Клекатаннем буслы будзяць ранак,
Краю роднаму рады яны.
Папраўляюць старую буслянку –
Доўгі шлях ад вясны да вясны.

У залітае промнямі неба,
У празрысты спакой цішыні
Уліваецца песня аб хлебе –
Жаўрукі славяць гожыя дні.

Вышэй птушак сялянская зорка
На гарачай арбіце стаіць:
Наша сонца ў нязменным дазоры –
Хто імкнецца, таму і гарыць.

З цяплом першым вяскоўцы ў паходзе.
Гуртам рушылі ўсе на паклон
Да карміцелькі, бо па прыродзе
Ёй давераны наш хлебны трон.

На раллі, сенажацях, на пашы
Працадзень ад зары да зары,
Каб на свята да хлеба і кашы
Былі яйкі, смятанка, сыры.

У сялян распарадак звычайны:
Хлеб расціць і дзяцей узнімаць.
Свайго лёсу спрадвечную тайну
Ім не хопіць жыцця адкрываць.

**Харчатрад**

Мы, вяскоўцы, здаўна – змагары ўсе
За прывагу, надой, ураджай.
Ці хто скардзіўся дзе, што змарыўся?
Грэў бы рукі цяплом каравай.

Гэта клопат не толькі сялянскі.
Тут дзяржаўны, лічы, інтарэс.
А таму для партыйнай падказкі
Шле падмогу райком на працэс.

У камандзе раённай эліты,
Хто спяшаў на калгасны мехдвор,
Дзе галоўны тэатр хлебнай бітвы,
Ваенком, сам суддзя, пракурор.

Не стаяў і рэдактар дзесь збоку
Ад сяўбы, ад настрою людзей.
Ён штодзень у пасёлак Шырокі
Кіраваў на арэну падзей.

І ў суседнім сяле быў адказны,
Там начальнік міліцыі. Ён
Не сядзеў у куточку бясстрасных.
Харчатрад – і яго эскадрон.

Каб знянацку зіма не застала,
Інстытуту адказных райком
Даручыў трымаць планку трывала –
Да зямлі ідуць з торбай пяшком.

**Аднакласніца**
Мы – дзеці-падлеткі,
Я – твой аднакласнік.
Бацькам нясе кветкі
Дзяўчынка-выдатнік.

То грыўка направа,
То грыўка налева.
Прыгожа і жвава
Расла і сталела.

Дыктоўкі, задачы
Штодзень ускладняла.

Я раптам убачыў:
Ты сонейкам стала.

Галінкаю бэзу
Пад зоркамі мая.
Дзяўчынку-гарэзу
Клас сёмы кахае.

Банты – быццам фарбы
Вясёлкі над рэчкай.
Лічыў я: для сябра,
А ён не пярэчыў.

То грыўка налева,
То грыўка направа.
Саму каралеву
Каханне спаткала.

Яна чырванела,
Тайком уздыхала.
Нарокам нясмела
Суседа кранала.

Трывога жыгнула
Душу, яе сэрца.
Сцяжынка звярнула
З находжаных месцаў.

Хвалюе, натхняе
Чароўная сіла.
Святло лье над краем,
Якое не сніла.

У новыя фарбы
Прастор адзявае.
Каханне да скарбаў
Сваіх далучае.

Яе аднакласнік
У вобразе мілым
Стаў марай аб шчасці,
Аблiччам на крылах.

Звінела гітара
За школьным парогам.

– Тамара! Тамара! –
Я клікаў з дарогі.

А ты не пачула.
Ці я не паверыў,
Што першым пачуццям
Лёс можна даверыць.

Выдатніцу з бантам
Рака падхапіла.
Плыла без гарантаў,
Дзяцей парасціла.

Сардэчная тайна
Ішла з ёю поплеч.
Страчала світанні
Пасля хмарнай ночы.

Жаночая доля –
Чаканні на ганку.
Жалейкай у полі
Згараюць заранкі.

Але не стухае
Жар школьнога лета.
І памяць вяртае
Па парце суседа.

Ужо не чакала
З далёкім сустрэчы.
Ды шчасце – сабрала
Іх школа на вечар.

Сваіх выхаванцаў
Вітае, бы птахаў.
Нямнога абранцаў,
Ды свята з размахам.

Амаль паўстагоддзя
Жыццё рыхтавала
Герояў і суддзяў
Да дня карнавала.

У ролях ранейшых
Прыйшлі вы з суседам:

Каханнем – ты, першым,
Ён – проста паэтам.

Удзячныя лёсам –
Па сілах крыж неслі.
На вашых пакосах
Ёсць месца і песням.

Бы позірк матулін –
Малюнкі юнацтва.
У іх так утульна,
Ды нельга застацца.

Як цяжка дарогі
Даюцца з гадамі.
Ідзём да знямогі,
І мары – за намі.

Няма самой школы,
І знеслі будынак.
Бярозкі наўкола
Заместа сцяжынак.

Дзесь кружаць з вятрамі
Дні нашай планеты.
Сустрэчы з сябрамі –
Да іх нам білеты.

**Радасны прысуд**
Зямля святкуе адраджэнне.
Прастора поўніцца цяплом.
Сам красавік у захапленні
Плыве над Сожам, над Дняпром.

Міжрэчча па струменях-промнях
Імкне да сонца ўсёй душой.
Рунь млее на палях-далонях,
Настрой фарбуе лес вясной.

Блакіт разносіць гам птушыны.
Заліты небам поймы рэк.
На мель пайшоў шчупак з глыбіняў,
Пачаўся нераст, як спрадвек.
Рыбак – народ ён церплівы.
У маі груша зацвіце,

Саб’ецца язь у гурт бурлівы,
Каб даць працяг жыццю ў вадзе.

І вось пасля пара настане,
Для сэрца радасны прысуд:
Ад рання я і да змяркання
Нібы прывязаны да вуд.

Ад сонца стрэшкай – брыль зліняла.
Вачэй не зводжу з паплаўкоў.
Хто не цягаў ляшчоў з лінямі,
Не зразумець ім дзівакоў.

**Адамаўна**
Па ціхай вулцы крочу
Пад зелянінай дрэў.
Дом вокнамі – у вочы,
Глядзіць, бы сябра стрэў.

Падаўся голас звонкі.
Адамаўна? Адкуль?
То друга майго жонка.
Мы разам тут пакуль.

У дом гасцінна просіць –
Рукі знаёмы жэст.
Наплыў падзей не зносіць
Тых дзён высокі змест.

Бясконца будні беглі:
Работа, дом, райком.
Жыццё з адной купелі
У свет вяло пяшком.

Каштоўнасці і вера
У нас былі адны.
Сяброўства і кар’ера
Не блыталі хады.

Няма тэатраў малых,
Вялікіх не было.
Міжрэчча ў сваіх залах
Нам сцэну адвяло.

Сунічныя паляны,
Гукаў грыбны сезон,
Дняпроўскія туманы –
Плацкартны мой вагон.

Сабакі, чую, гоняць
На нумары звяроў.
Гатоў чатырохногіх
Расцалаваць сяброў.

На паляўнічай сцежцы
Узведзены куркі.
Зайцы ўзляталі з лежні,
А шчасціла – дзікі.

На часткі рвуць спакусы.
І зайздрасць – цяжкі грэх.
Я сябрам ганаруся.
Ён моцны, без прарэх.

Гады карункі вяжуць:
Яму, мне – свой узор.
Пра друга дрэнна скажуць,
То – камень і ў мой двор.

Святочныя застоллі,
Размеркаваны быт,
Раённыя гастролі
Нёс рамантычны плыт.

Жыццё не раз кідала
З далёкай той пары
Іх на дрыгву, на скалы.
Трымаліся сябры.

Спяшала і падмога…
Не тым, хто сам валок.
Не кожнаму дарогу
Пяройдзе злыднем воўк.

Да друга шлях няблізкі:
Жыць выпала ў Маскве,
Адамаўна ж – у Мінску.
– Убачыцца б, – заве.

– З якой цяпер пасады, –
Шаноўная, скажы, –
Гасцям у доме рады?
Дзесь плачуць капяжы.

Заходжу ў памяць скарбаў,
Бы ў веснавы настрой.
Па восеньскіх ухабах
Ты крочыш не са мной.

Ад сябра незалежны
Палёт высокі ваш,
Цяпер ён – у замежжы,
Дзе думаюць інакш.

У далікатнай справе –
Знайсці былы маршрут,
Не дапаможа нават
Канстытуцыйны суд.

**Чырвоны карнавал**
На флагштоку мяняюцца сцягі.
Якой зараз уладзе служыць?
Мы давалі аднойчы прысягу,
Загад зверху – па-новаму жыць.

У дні горкай чарнобыльскай комы
На чырвонае ставілі нас.
Строга слухалі рапарт абкомы,
У ЦэКа рыхтавалі свой сказ.

Першамайскаму святу калоны
У натруджаных неслі руках
Кіламетры, гектары, мільёны,
Веліч, поступ, савецкі размах.

Голас дзячыў з трыбуны бадзёра
За рэкорды, працоўны напал.
Гэта звалася шчасцем учора.
Гэта быў наш з табой карнавал.

Аркестр школьны на плошчы іграе.
Меддзю ззяе на сонцы труба.
Большы сын з яе марш выдзімае.
Барабаніць малодшы. Хіба

Можа ён ад старэйшага брата
Па двароваму рэйтынгу быць
Дзесьці знізу. Хлапчук зухаваты,
Крок у крок меншы з большым бяжыць.

Член бюро, бацька іх на трыбуне –
Летапісец мясцовых падзей.
Хаця ён ад сябе патрабуе
Куды больш – выйшлі б людзі з дзяцей.

Маці шчасця свайго не хавае –
Хіба ж можна прыгожа так жыць?
У калоне з настроем спявае.
…шосты дзень, як рэактар гарыць.

Разлілася рака Першамая,
Над святочным парадам кумач.
Хмара колер яго закрывае.
Ужо кружыць Чарнобыль-крумкач.

**Сяло над ракою**
На машыне няспешнай хадою –
Праз сасоннік, што стаў у рады.
Не дае ўсю дарогу спакою
Гэты лес, ён зусім малады.

Чвэрць стагоддзя амаль праляцела.
А, здаецца, учора было:
Монстр-рэактар гарыць звар’яцелы,
Ахінае свет чорным крылом –

Гарады, смех дзіцячы і вёскі,
Пералескі, палі і лугі.
У абдымках рэнтгенаўскай ласкі
Рака Прыпяць, яе берагі.

Неслі хмары зямлі атручэнне,
За трыццаты пайшлі кіламетр.
Замест сцэны аб казцы вясенняй
З радыяцыяй выйшаў сюжэт.

А яна ўсё глыбей асядала
У паветры, у глебе, ядзе.
У дазіметры рэквіем грала
На піскляваай да жаху дудзе.

Заглушала медзь школьных аркестраў
І напевы святочных калон.
І збіралі дзяцей маці спешна –
На вакзале чакаў эшалон.

Бралі курс цягнікі ў невядомасць,
Самы горшы сцэнарый падзей.
Мужнасць зноў, гераізм і свядомасць
Сталі мерай галоўнай людзей.

Майскі дождж з навальніцай спрадвеку
Для зямлі – новай сілы прыліў,
І ніколі бяды чалавеку
Не прыносіў. Нябесны паліў.

Шчодра ён напаіў лугі, нівы,
Па палетках прайшоў перуном.
Абвясціў – будзе год урадлівым,
Не хвалюецца хай аграном.

І цяпер у вачах тое ранне:
Пад высокім блакітам – палі,
Па-над Сожам на руні бяскрайняй,
Нібы іней, гараць крышталі.

Вясны водар, прастор, блазнюк-вецер,
Незямнога гатунку святло…
Не купіць за ўсе грошы на свеце
Той пейзаж – «Над ракою сяло».

**Зона адчужэння**
У напеў веснавой пастаралі
Уварваўся з дажджом ураган.
І нуклідаў нябачныя хвалі
Пачалі свой смяртэльны канкан.

Разгубіліся самі стагоддзі,
Хаця свет не на скокі вялі.
Людзям гвалту і жудасці годзе.
І вось самі пажар развялі.

Планетарны касцёр разгарэўся.
Не здарэнне, а кропка, мяжа.
Ля агню хтосьці з радасцю грэўся,
Бог тым часам сядзеў, разважаў.

Чалавек – гэта што за істота?
На любую пасаду ідзе –
Прывілей, і паболей, ахвота.
Хто б адказнасць узяў за людзей.

Краўся атам у хаты праз форткі.
Заняў пожню, сады, кожны двор.
Стаў у лёсах крутым паваротам,
Непадсудным пісаў прыгавор.

Тэрыторыя шчасцятварэння,
Замяніў стронцый севазварот,
Стала зонай трывог, адчужэння.
І сюды пад замком уваход.

Зруйнавалі бульдозерам фермы,
Зруйнавалі сядзібы сялян,
Кусты бэзу, плакучыя вербы
І вясенняга звону дурман.

Дзе гармоніку пець цяпер песні?
Дзе калодзеж, каб піць жураўлю?
Як з радзімы атручанай знесці
Памяць продкаў і мару сваю?

Лясы сталі на нівах сцяною.
Дрэвы выйшлі на трэці паверх.
Для звяроў – гэта царства зямное,
Для людзей – недараваны грэх.

Па-ранейшаму сонца ўзыходзіць.
Па-ранейшаму вёсны гарац.
Вось шкада, што ў маім агародзе
Ужо некаму жыта дажаць.

2011

# ПЕРАКЛАД З ФРАНЦУЗСКАЙ
## Паэма

Так хочацца ў Парыжы заблудзіцца,
Які вясну да сэрца прытуліў.
Яшчэ нам доўга потым будуць сніцца
Сітэ і Елісейскія палі.

I

З Дамадзедава я да Парыжа
Даімчаўся, нібы на метро.
Увайшоў у Філях ранкам рыжым,
А выходжу – і вось вам Дзідро.

– Не сядзіцца табе, дома мулка? –
Цэлы дзень сын з прымусам пытаў. –
Лепш абновай пацешыў унукаў.
Шмат краёў, куды ты не лятаў.

Не ўсхваліў і таварыш гастролі:
– Столькі грошай завезці, куды?
У кафэ я сяджу на Рыволі
І спакойны да іхняй нуды.

Гумар родных сваіх разумею.
І не злосна зайздросцяць сябры.
А пішу я жыццё, як умею.
На базар мы ідзём да пары.

Адпачыць маю права, нарэшце.
Сваё свята знайсці на чужым.
Паглядзець на святы горад, грэшны
І з настроем далей марыць, жыць.

II

Я святочны касцюм адзяваю:
На спатканне з Парыжам іду.
Да кашулі кашнэ падбіраю,
З новых туфляў пылінкі ўсе здуў.

А навокал вясна – заглядзенне.
Нездарма ж калісь рускі паэт
Шэрай ружаю ад захаплення
Назваў горад. Вось востраў Сітэ.

Ён па Сене плыве ўвесь духмяны.
Кветка бэзу імкне да рукі.

Пах чаромхі душу абдымае,
І па-руску шчабечуць шпакі.

Аналогій зусім не шукаю.
Па тутэйшай я крочу вясне.
Зноўку кніжкі дзяцінства чытаю.
Пазнае, мабыць, горад мяне.

Мушкецёры ў гісторыях вечна.
Ад дварцовых інтрыг – ратуй, Бог.
У Бастылію? Дзякуй сардэчна!
Рэвалюцый з нас хопіць і трох.

Хаця з вашай народнай стыхіі
Выйшаў рускі Гаўрош барыкад.
Не канчаюцца годы ліхія…
Талерантнасць  у вас? Заняпад.

Я іду па прыступках Нотр-Дама.
У саборы спыняецца час.
Тры каханні, адна панарама
І хімеры – прытулак грымас.

Ачышчальныя гукі аргана
Пад скляпеннямі сэрцам лаўлю.
Ды не ўсім ружа падаравана.
Я спускаюся зноў на зямлю.

На шляху абяцанкаў ілжывых
Не знайсці чалавеку свой храм.
Певень зорка глядзіць за Парыжам,
Добра відна са  шпіля Нотр-Дам.

III
Белы плашч – падарунак ад сына.
Дабрачыннасць на твары ляжыць.
Што сказаць, пасьпяховы мужчына –
Парыжанін прысеў адпачыць.

Бачу, злева і справа турысты
Навялі аб’ектывы ў мой бок.
І здымаюць. Хоць чымсьці карысны
З інтэр’ерам Нотр-Дама сядок.

Фотасесію скончыў я раптам.
Бо за востравам трэба сачыць.
Ён вясною хварэе Манмартрам,
Там усе, каго трэба лячыць.

І Сітэ, я баюся, заблудзіць.
Раптам збочыць у страсці вясны.
І крычу: – Сцеражыцеся, людзі!
У Парыжы разводзяць масты!

Прапусціць прашу востраў дачасна,
Пакуль поўныя воды ракі
Нясуць весела лодкі, баркасы,
І па-руску спяваюць шпакі.

У прахожых – ні кроплі здзіўлення,
У Сітэ веснавы праменад.
Людзі з радасцю і разуменнем
Падтрымалі высокі парад.

Фіялетавы колер, ружовы –
Антураж выбірала вясна.
Нясе службу мастак адмыслова.
Фарбы льюцца наўкол да цямна.

Па рацэ пад вясёлкай дазорнай
Вядзе востраў сама прыгажосць.
Водар свята стаіць непаўторны.
Вось шкада, што я тут толькі госць.

IV
Пад намоленым дахам Сарбоны
Мужнеў рускай паэзіі цвет.
Творцы доўга яшчэ да скарбонкі
Будуць браць свой галоўны білет.

За натхненнем спяшаюць паэты.
Абнаўляе гламур гардэроб.
Блазнюкі на пацешнай карэце
Натоўп цешаць і знатных асоб.

Тут гуляў і стамлёны Ясенін –
Сам "Максим" гарманіста прымаў.
У Высоцкага рваліся нервы,
Ён складаны шлях скрозь выбіраў.

А інакш ты не будзеш паэтам
У занесеных снегам палях.
Каб ліліся ад сэрца куплеты,
Здабываць трэба словы ў баях.

Парыж помніць і сёння буянаў.
На радзіме яны – песняры.
Вершы іх – боль аголенай раны
На знявечаным твары зары.

Сан-Мішэль. На бульвары Данцова
Прывітальна махае рукой.
Мы сустрэліся з ёй выпадкова.
У сабак яе добры настрой.

Я далей па шляху сваім крочу,
Дзе амарам нязручна гуляць.
Негры будзяць парыжскія ночы,
Мне таксама не хочацца спаць.

V
Нагадайце гісторыю нашу:
Колькі помніш дарогі свае,
Для французаў – душа нараспашку.
Там і бой, і пажар у Маскве.

Як прэстыжна было ведаць мову.
Іх парфум – самы лепшы, лічы.
Басурманін – і лекар, і повар,
Дзяцей грамаце барскіх вучыў.

Мы вядзем пераклад навук, моды.
Пераймаем, як дом шанаваць.
І шукаем з краінаю згоды –
Там жа нашых! Каб разам сабраць…

Генералы, артысты, саветнік –
З рускім жарам служылі яны.
Стаў Нурыеў там зоркай балета,
Нібы дома насіў кайданы.

Легіён прайшоў праўдай і верай
Пешкаў наш, а пасля іх пасол.
Дэ Голь Мельніку Косцю даверыў
Небяспекі трымаць парасон.

Ад цара людзі беглі з Расіі.
Ад Саветаў – вялікі зыход.
Эміграцыі хвалі касілі
Мужны, стойкі, рашучы народ.

Колер нацыі, лепшыя з лепшых
Знайшлі схову ў Парыжы ад зла.
Шлях зямны яны потым завершаць
Дзесь на Сэн-Жэнаўе-дэ-Буа.

Дэмакраты на словах шкадуюць,
Што рэжым выгнаў столькі людзей.
І ў Ізраілі месца рыхтуюць
Для магілы сабе, для дзяцей.

Па смаленскай дарозе на захад,
Па якой уцякаў Банапарт,
У абозе разумных, багатых
Мы ідзём уздоўж кінутых хат.

Наш «Тытанік» дрэйфуе ў тумане,
І нідзе берагоў не відаць.
Калі ж мода ў Расіі настане –
На радзіме старым паміраць.

VI
Ру Муфтар у Лацінскіім квартале,
Вулка, калісь дарога на Рым.
Тут на досвітку многія ўсталі –
Дзень базарны малым і старым.

Аркестр вулічны вальс падбірае.
Прабуджаецца сонны народ…
Градус свята кірмаш узнімае,
Пачынаецца людаварот.

Сыр, каўбасы – па густу тавары.
Пах такі, ажно слінкі цякуць.
Падае збоку голас гітара.
Тут святкуюць і шопінг вядуць.

Гоман, музыка, гандаль і танцы.
Пачаў танга выводзіць аркестр.
Кружаць пары, за спінамі ранцы,
Напаўняецца ролямі змест.

З круасанамі кава – сняданак.
У кафэ памяркоўны спакой.
Зазірнуў я сюды гожым ранкам
Па цячэнню ракі гарадской.

З парыжанкай танцуем мы танга.
Мяне свята, нарэшце, знайшло.
Дварняк зводдаль ляніва з заўвагай:
" Ну паеў, а вось скача нашто?"

VII
Мог не раз на шляху спатыкнуцца
Інжынер, пакуль нёс свету дар.
Расла вежа на зайздрасць сталіцам,
Яе творца – нягоднік, махляр.

За спіной чуе кпіны, паклёпы.
Эйфель слухаў і ўсё будаваў.
Ён карункамі вежы сталёвай,
Быццам сам, побач з Сенаю стаў.

Мала мець у жыцці яркі талент,
Трэба мужнасць яму, каб лунаць,
Пад агнём перуноў і маланак
Рушыць шэрасць і коснасць ламаць.

Сталаяваю смелая мара.
Вышыня – дзівакам па плячу.
Сонца ім свеціць нават праз хмары.
На вяршыню Парыжа лячу.

Неба шпілем пранізана вежы.
Зверху горад відаць навылёт.
Гарызонт расступіўся, здаў межы,
Шлях адкрыты ў міжзорны палёт.

Распусціў з вежы-мачты я парус.
Поўніць вецер касмічны яго.
Ад Зямлі з нараджэння ёсць статус –
Капітаны мы судна свайго.

Я планету выводжу на трасу,
Курс ляжыць на сузор’е Надзей.
Кажуць, там не патрэбны грымасы,
Каб аблічча хаваць ад людзей.

VIII

Не залічыць вясна-парыжанка
Без Версаля французскі сезон.
Уваходжу расквечаным ранкам
У палац пад часоў перазвон.

У гісторыі аўтараў многа,
Часта творцаў з-за іх не відаць.
Сэнс адзін у жыцці – перамога,
А дзе праўда – ужо не спытаць.

І Людовік не ведаў фіналу,
Калі мусіў свой храм будаваць.
Пройдзе час. І не ступіць у залу
Ні нагой сонцаносная знаць.

Інтэр’ер каралеўскіх пакояў,
Ідэалы далёкіх гадоў
Нам у вочы глядзяць з непакоем:
Хто іх вартасць прадоўжыць гатоў?

Вернісаж пераможных паходаў –
Усёй Францыі нізкі паклон.
Сярод гордых і гучных знаходак –
Імператар, сам Напалеон.

Новы светач закон перапіша,
Перакрэсліць усіх каралёў.
Гільяцінай у двор праб’е нішу
І рахунак пачне заваёў.

Яго трон узнясецца над светам:
Ён – імперыі слаўны кароль.
З часам згасне і вечнае лета,
Дзе ў цяні слёзы гушкаюць боль.

Рускай тэмай канчаецца споведзь
Імператара, генія зла.
Ён – герой у краіне, і моладзь
Усе плямы з мундзіра звяла.

А за сценамі замка – раздолле.
Сонца промнямі поўніць прастор.
Запрашае вясна на застолле
Караля і ягоны ўвесь двор.

– Ах, Версаль! – захапляюцца людзі.
Не ўсё роўна яму, ды і мне,
Хто на баль урачысты прыбудзе –
Уваход па высокай цане.

IX

Электрычкі развозяць няспынна
По краіне сталічны камфорт.
Жыць шчаслiва французскай жанчынай –
Інтэр'ер не псуе яе форм.

Па асфальце абцасік стукоча,
У ажурнай панчосе нага.
Бездарож ёй у вёску не крочыць,
І не стоміць за праўдай чарга.

2012

МУЖЧЫНА І ЖАНЧЫНА

Імчыцца электрычка –
Касмічны дыліжанс.
На мой настрой сталічны
Кладзецца сельскі сказ.

Правінцыя. Бы споведзь,
Я чую праз акно,
Як нівы яе родзяць,
Глядзіць пра што кіно.

Нармандская сюіта
Абветранай зямлі –
Курортная эліта:
Давіль, яшчэ Трувіль.

Двух гарадоў усмешка
На беразе адным.
Жыццё цячэ няспешна,
Дзе час скрозь малады.

Вясна на прыбярэжжы
Расквеціла прастор.
Салёнае бязмежжа
Вятры нясуць да гор.

Па хвалях на маторах,
На белых парусах
Па ўспененым прасторы
Прыходзіць лета ў снах.

Сюжэт старых палотнаў,
Там – акіян святла.
Людзей стаміла слота,
Свет прагне да цяпла.

Іх, белых, хвалі вабяць
У ласкавы прыбой,
У сонечную замець,
У каляровы строй.

Мужчына і жанчына
З вакзала Сен-Лазар
Душу вясне адчыняць.
Ім вецер – пругка ў твар.

Раптоўнай прахалодай
Не тушаць сэрцаў жар.
Пачуццяў асалода,
Расце страсцей пажар.

Бадзёрае паветра,
Хоць на кавалкі рэж,
На круасан – паверсе,
І прама з кавай еж.

Бы музыка, пейзажы,
У фарбах гукі нот.
Над хвалямі выразна
Чуваць вятроў акорд.

Блакіт вады і неба
Абняў зялёны край.
Да шчасця ў колер трэба
Каханку ў гэты рай.

Гляджу: пляж у Трувілі –
Дзве постаці стаяць.
Гатоў мол у Давілі
Гасцей таксама ўзяць.

Не перадаць у фарбах,
Ні музыкай сказаць.
Што небу дыфірамбы?
Патрэбна там лятаць.

Нясуць увысь на крылах
З Атлантыкі вятры.
З нармадскай эскадрылляй
Узняліся браты.

2012

## *КАРАЛАВЫ ВОСТРАЎ*

### СЛЯДЫ НА ПЯСКУ

Індыйскі акіян вітае ранне
На беразе сярэбраных пяскоў.
Я крочу па разбужаным світанні
З такіх далёкіх і чароўных сноў.

У джунглях дзесь блукаюць рэшткі ночы,
Недагарэўшы на кастрах уцех.
Іх след яшчэ вось – на пяску, жаночы,
На мове незнаёмай ціхі смех.

Пакуль Ціфані гойдалі ўзбярэжжа
На хвалях танцаў, музыкі, віна,
Спаў акіян, адлівам зрушыў межы,
Аддаўшы сушы гоні свайго дна.

След па пяску разбэшчанаму ўецца,
У лукаткі прывёў у акіян.
Шчаслівы шлях бясконцым скрозь здаецца.
Дзіўлюся я на крохкі побач стан.

Дзяўчом яна, яшчэ да паўналецця,
Спусцілася ў іх маляваны рай.
Пад пальмамі нясе па эстафеце
Сусветны вобраз мілавідных тай.

Адны мы млеем пад спякотным сонцам.
Нібы малых, нас цешыць акіян.
Ён збочыўшым з маршруту марафонцам –
Бальзам гаючы да глыбокіх ран.

На гарызонце лайнер беласнежны
Нясе ў блакіт чужацкае жыццё.
І я плыву па хвалях, госць замежны,
Мне б кроплю срэбра ўзяць сабе ў шыццё.

Хаця вяду я ўзор не белашвейны.
Мае грукочуць кросны праз гады.
У дождж залю палотны, у завеі,
Каб даць у росах колер залаты.

2011

БАРХАТНЫ СЕЗОН

Так стамілася цела, не чую душы.
Чэрствы свет сам сябе даядае.
Дзеці просяць мяне: "Ты аб светлым пішы".
Толькі ліра даўно не спявае.

За натхненнем на востраў далёкі лячу,
Дэ Маёрка яго называюць.
Я пад сонцам хандру ў падарожжы лячу –
Час прыціх, яго тут спажываюць.

Як зямля загарэла: пейзаж залаты
У каралях блакітнага свята.
Пальмы кружаць пад вечна зялёны матыў,
Ім прыбой падпявае крылата.

Мову ласкавых хваль разумеюць усе,
Каго ў моры знайшла асалода.
Востраў шчодра падносіць гасцям пакрысе
І карыду, фламенка, прыгоды.

Не паказаны мне іх шыкоўны загар,
На чарнобыльскі ён не кладзецца.
Хоць паўднёвая спёка тут ходкі тавар,
Ёсць яшчэ да чаго прыглядзецца.

Вузкай вулкай вядзе мяне стары манах
Праз снабізм Вальдэмоса-Ла Гранха.
Тут багемы куток, у лясістых гарах
Сам Шапэн задыхаўся ад пахаў.

З той часіны бамонд да святых зачасціў,
Стала модна ў гарах тусавацца.
Добры тон паказаць – глыт паветра для дзіў,
Тых, што ў Луўр прыязджаюць крыўляцца.

Мой іспанскі сезон, марай змераны час, –
Да згарэўшага лета дадатак.
Фарбай сонечных дзён размалюю Парнас,
Дзе з маленства знаходжу прыстанак.

Вось і скончыўся акт. Я, турыст і глядач,
Шлях дадому са свята трымаю.
Там – у рукі рыдлёўку, і куча задач:
Новы крызіс нам Сэм аб’яўляе.

2011

## КАРАЛАВЫ ВОСТРАЎ

На крылах каравелы грацыёзнай
Я апусціўся ў пахмурны Бангкок.
На выгляд, горад стройны і сур'ёзны, –
Трывала ў джунглях трэба ставіць крок.

Чужым – экзотыка: сланы на волі,
Па тропіках магічны праменад.
Здараецца, засмуціць наваколле,
Калі нясе цунамі вадапад.

Мусоны зацяжныя неба змылі,
Злілі блакіт дажджамі ў акіян.
І малпамі калматымі і злымі
Гасцей пужае ранішні туман.

І ў нас на моры Лапцевых не рэдкасць
Слата, завеі, шэры гарызонт.
Дарэмна штурмаваць нягоды крэпасць.
Да дзірак мой знасіўся парасон.

А тут прыбой штосьці пра прыліў лапоча.
Сярэбраным пяском здзіўляе дно.
І верыш, што так хораша аднойчы
У хвалі свету расчыніць акно.

На востраве каралавым згубіцца,
Какосавая пальма на дваіх.
Пясок скрозь пальцы белы будзе ліцца.
І так дарэчы, што мусон суціх.

2011

## ЧЫРВОНЫ ПАЛЁТ

Праз восені шэрыя фарбы
Спяшаюць буксіры ў затон.
На баржах апошнія скарбы
Нясуць яны з сонечных дзён.

З чырвонай жанчынай сустрэча
Мяне сярод хваляў знайшла:
Агніста сукенка трапеча,
Яна так да твару была.

Як казка чароўнага лета
Квітнела на палубе ты.
Над Волгай ліліся куплеты,
Я крочыў на іх з нематы.

Ззяў золатам брыль твой ад сонца.
З карункаў рубін выглядаў.
Малінавы шалік бясконцы
Да туфляў пурпурных спадаў.

Дурманіў настой з лугоў кветак,
Даносіўся водар лясоў.
Звінела лагодаю лета
У медзі тваіх валасоў.

Мы з Месяцам разам спявалі
У рытмах сардэчных дарог.
Уздоўж берагоў іх праклалі
І прама – у зорны астрог.

Нявольнік шчаслівай сустрэчы,
Выпадак – адзін на мільён:
Бывае ж, прыводзіць Шлях Млечны
Багінь на крамлёўскі прыём.

Пад сцягі барвовага рання
Вяртае нас першы прамень.
Мелодыя летніх спатканняў
Мяне даганяе штодзень.

Вось-вось навігацыя стане,
З зазімкамі крадзецца лёд.
Але маразы ўсе не ў стане
Спыніць мой чырвоны палёт.

2010

ЗІМОВЫЯ КВЕТКІ

Мастак пад знакам поўдня
Малагу маляваў.
Спачатку вохрай промні
На палатно паклаў.

Лазуркай вывеў неба,
Ніжэй – аквамарын,
Курорту ж мора трэба.
Над ім – фантом зары.

Ламаны выгіб – горы
На сінім палатне.
Па схілах крочыць горад
У белай сутане.

Дадаць харызмы трэба:
Скрозь кветкі і трава,
На пальмах – птушак шчэбет.
Такі вось карнавал.

У казачную яву
Пашчасціла білет.
Адгул далі мне справы
У снежаньскі сюжэт.

Вітае клуб Ла Коста,
Фасону не займаць.
Апартаменты. Проста
Тут жыць, нібы спяваць.

І на Міжземным моры,
Дзе мроі ажылі,
У сонечнай віхоры
Я чую капяжы.

Гэта зіма дагнала
Мяне пад пальмай тут.
За ўвесь задор спагнала.
Дзе выйсце з яе пут?

Бы стоўбень хмары сталі,
Знаць, трапілі ў затор.
Іх моцна прывязалі
За верхавіны гор.

Між небам і зямлёю
Крадзецца парапет.
Дажджы вісяць сцяною,
Змываюць белы свет.

На вуліцу не выйсці,
Які тут парасон?
Зіма зялёным лісцем
Засыпала балкон.

Яе іспанскі нораў –
На беларускі лад?
Гул перуноў над морам
Мне блытае расклад.

Злуецца, стогне вецер,
Лютуе з ім прыбой.
Калі ж курорт, нарэшце,
Прыпіша мне спакой?

Зіма за мной кульгае,
Дзе б ні шукаў прыгод:
І там, дзе кветкі ў маі,
Дзе кветкі – круглы год.

2011

## КАРАЛЕЎСКІ ПАДАРУНАК

*У Гранадзе знаходзіцца магільны склеп каталіцкіх каралёў Ізабэлы і Фердынанда. Яны падрыхтавалі падарожжа Калумба, у час якога была адкрыта Амерыка.*

Над Сьера-Невадай
Плыве каравела:
– Прывет Фердынанду!
Салют, Ізабэла!

Кароль з каралевай
Пазналі Калумба.
З Амерыкі смелы
Марак прывёў судна.

Утома на тварах
У першапраходцаў.
Па кошту ахвяры
Цана і знаходцы.

Пад ветразем рваным
Прайшлі паўпланеты.
Сярод акіяна
Знайшлі аж паўсвета.

Ад шчасця каманда,
Нібы звар’яцела:
– Прывет Фердынанду!
Салют, Ізабэла!

Зрываюцца струны…
Зямля, калі ласка,
Прымі падарунак
Кароны іспанскай.

У смутку туманаў
Марскіх падарожжаў
Знікаюць пытанні,
Што сон мой трывожаць.

2012

ШЧАСЛІВЫ ГОД

### СТУДЗЕНЬ

Па Шляху Млечнаму нясуцца сані –
На баль спяшае студзень-снегавік.
Іскрысты лёд звініць пад палазамі,
А Новы год пачаў ужо адлік.

### ЛЮТЫ

Зіма па гурбах коціцца завеяй,
З ёй прывітанне люты свету шле:
Хадой скрыпучай снежнай эпапеі,
Узорамі марознымі на шкле.

### САКАВІК

Пад сонцам крочыць сакавік бадзёры:
З зямлі сумёты знеслі раўчукі,
Развесіла з блакіту неба шторы,
Вясну на дрэвах гушкаюць гракі.

### КРАСАВІК

Пралескай красавік стаіць у лесе,
Прывеціў першацветам паплавы –
Радкі з вясенняй каляровай песні.
Цяпло нясуць на крылах журавы.

### МАЙ

Зямля памаладзела ў кветках мая,
Дождж ураджайны абяцаў прагноз.
Чаромхавы дурман плыве над гаем,
І пошчак салаўя – апафеоз.

### ЧЭРВЕНЬ

На нівах хлебных жыта красавала,
На лузе чэрвень сена варушыў.
Зязюля доўгі век накукавала,
Пакуль суніцы поўнілі кашы.

### ЛІПЕНЬ

Над рэчкай ліпень рэхам навальніцы
Дзіцячыя разносіў галасы.
Канікулы – пара збіраць чарніцы
І за вясёлкай правіць парусы.

### ЖНІВЕНЬ

Так хутка лета дні падсумавала,
Дажала хлеб на дальняй паласе,
Бы яблык наліўны, у садзе ўпала,
У сны пайшло па жнівеньскай расе.

### ВЕРАСЕНЬ

Стаміўся верасень на нівах шчодрых
Збіраць дары карміцелькі-зямлі.
Плывуць у свет птушыныя чароды,
Згарае лес у залатым агні.

### КАСТРЫЧНІК

Цяпло з зямлі вятрамі здзьмуў кастрычнік,
Пусціў на неба хмары на пастой.
Дажджы ва ўсе куткі на электрычках
Штодня вязуць людзям сыры настрой.

### ЛІСТАПАД

Рабінавым кастром згарэла восень.
Па цёплых днях адплакаў лістапад.
Азімыя палеткі снег заносіць,
Каб да вясны сагрэць спакой зярнят.

### СНЕЖАНЬ

Сняжынкамі фарбуе снежань скроні.
Выводзіць белы танец гарманіст.
Пад снегапад спыняе год пагоню:
Упаў з календара апошні ліст.

2011

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЕ ВЫДАННЕ

Калінічэнка Валерый Іванавіч

РОДНАСЦЬ
Вершы. Паэмы.

Рэдактар М.М. Чарняўскі.
Тэхнічны рэдактар А.Я. Крычаўцоў.
Камп'ютарны набор Г.М. Харашылава.
Мастак Г.В. Мяркулава.
Дызайн і кам'ютарная вёрстка Н.Н. Назарова.
Карэктар А.С. Пятрова.

ИПО "У Никитских ворот"
121069, Москва, ул. Большая Никитская, д.50а/5, стр. 1
Телефон: 8 (495) 690-67-19 www. uniki.ru